артыкулы

**Вольга Сабалеўская**
(Гародня)

## Межы талерантнасці: хрысціянска-іудзейскія стасункі на Беларусі ў XIX стагоддзі

Непазбежнасць суіснавання людзей розных палітычных поглядаў, рэлігійнай і этнічнай прыналежнасці паспрыяла стварэнню на Беларусі атмасферы талерантнасці. Аднак гэтая згода мела свае межы. Сярод хрысціянскага насельніцтва ў XIX стагоддзі быў распаўсюджаны міфалагізаваны вобраз яўрэя. У гэтым артыкуле, заснаваным на архіўных крыніцах, гаворка пойдзе пра асаблівасці рэалізацыі антыяўрэйскагя стэрэатыпу на розных узроўнях грамадства: ад царскай адміністрацыі да сялянскага і мяшчанскага асяроддзяў.

Вынік міжкультурнай камунікацыі залежыць перш за ўсё ад здольнасці бакоў ставіцца адзін да аднаго непрадузята і талерантна. Падчас кожнага ўзаемадзеяння адзін чалавек глядзіць на другога праз прызму ўласных уяўленняў аб маральнасці. На раннім этапе яны фарміруюцца ў рамках культуры паўсядзённасці. Назіраючы за тым, што адбываецца вакол яго, дзіця прывыкае лічыць акаляючае яго асяроддзе „правільным”. Эдуард Т. Хол трапна назваў стан рэчаў, пры якім грамадства разглядае ўласную культуру як эталон „культурнымі акулярамі”[1].

Не схільны да рэфлексіі чалавек носіць гэтыя акуляры, не здымаючы. Яго паводзіны можна назваць наіўным рэалізмам: ён не думе пра тое, што „правільнасць” нормаў яго жыцця з’яўляецца рэлятыўнай. Распаўсюджанне такога спосабу мыслення прыводзіць да фарміравання трывалых этнічных стэрэатыпаў, якія ператвараюц-

[1] Т. Г. Грушевицкая, В. Д. Попков, А. П. Садохин, *Основы межкультурной коммуникации*, Москва 2002, с. 30.

ца ў своеасаблівыя культурныя бар'еры. Такі стан рэчаў характэрны таксама і для фарміравання адносін паміж хрысціянскімі ўладамі Расійскай імперыі і іх яўрэйскімі падданымі ў XIX стагоддзі.

Яўрэі ўпершыню сталі жыхарамі Расіі напрыканцы XVIII стагоддзя. Да 1772 года прадстаўнікі гэтай этнаканфесійнай групы паслядоўна выганяліся з тэрыторыі краіны ўказамі Кацярыны I (1727), Елізаветы Пятроўны (1743), Кацярыны II (1762) і іншых уладароў. Прычынай настолькі негатыўнага стаўлення, якое яўна супярэчыла эканамічным інтарэсам дзяржавы, была адмоўная ацэнка гістарычнай ролі яўрэяў і рыс іх нацыянальнага характару. Яна была заснавана на стэрэатыпным уяўленні пра яўрэя-хрыстазабойцу, у абліччы якога канцэнтравалася ўсё самае адмоўнае і непрымальнае для хрысціяніна. Гэты вобраз меў настолькі значную эмацыянальную моц, што прымусіў Елізавету Пятроўну катэгарычна выразіць адносіны расійскага самаўладдзя да яўрэяў у форме вядомага афарызма: „Ад ворагаў Хрыстовых не жадаю цікавай карысці".

І вось напрыканцы XVIII стагоддзя Расія была вымушана прыняць яўрэяў у склад падданых для таго, каб не разбурыць гаспадарку набытых ёю паўночна-заходніх земляў. Гэта была сустрэча двух зусім розных жыццёвых сусветаў. Кожны валодаў цалкам склаўшайся сістэмай каштоўнасцей, укладам жыцця, сацыяльнай іерархіяй, заснаванай на рэлігіі, якая ў сваю чаргу займала важнае месца ў абедзьвюх карцінах свету. Улада і падданыя ад самага пачатку былі падзелены ідэалагічным бар'ерам. Стан рэчаў ускладняўся тым, што нягледзячы на тое, што XVIII стагоддзе ўвайшло ў гісторыю пад назвай часу Асветленага абсалютызму, яно ўсё ж такі не вылучалася „адкрытасцю свядомасці". Гэта быў час нізкага ўзроўню талерантнасці і распаўсюджання жорсткіх стэрэатыпаў нават у асяроддзі кіруючай „асветленай" эліты.

Вузкасць поглядаў назіраецца і сярод тых, хто павінен быў па характару заняткаў дастаўляць уладцам непрадузятыя і аб'ектыўныя звесткі пра новых падданых. Прыкладам можа быць *Думка пра прыпыненне на Беларусі голаду і ўладкаванне побыту яўрэяў* Г. Р. Дзяржавіна, які атрымаў ад Паўла I даручэнне інспектаваць беларускія землі і зрабіць выснову ці не яўрэі з'яўляюцца прычынай эканамічнага крызісу ў мястэчку Шклоў. Менавіта ў *Думцы...* Г. Р. Дзяржавіна ўпершыню з'яўляецца разгорнутая характарыстыка рыс яўрэйскага характару. Справаздача сенатара — гэта сапраўды збор размаітых бязглуздзіц пра яўрэяў. Як аказалася, „гэтыя дармаеды падманам і пранырствам існавалі за кошт сваіх гасцінных гаспадароў і трымалі іх заўсёды ў якасці сваіх даннікаў (...). Вераломствам нярэдка рабіліся ўласнікамі чужых маёмасцей (...). Цяж-

kіх прац як маглі пазбягалі, бо сваімі талмудамі былі ўпэўнены, што яны ўладарыць, а іншыя народы рабалепстваваць перад імі павінны".

Дзяржавін адмоўна ставіўся да адсутнасці ў яўрэяў схільнасці да сельскагаспадарчай працы, падкрэсленай паглыбленасці ў рэлігію, якую лічыў зборам „пустых абрадаў", варожых да іншых народаў. Сенатар абвінавачваў яўрэяў у амаральнасці: „Гонар для іх нічога не значыць. Сябе яны шануюць як найлепшых з усіх. Згодна з гэтым не здымаюць ні перад кім з галоў сваіх ярмолак (...). У справе з хрысціянамі ў іх праўды быць не можа. Гэта забаронена ім талмудамі". Каб вобраз быў поўным, дададзім, што, з пункту гледжання Дзяржавіна, яўрэі займаюцца чараваннем, эксплуатуюць хрысціян і адзін аднаго, маюць памылковыя ўяўленні пра кепскае і добрае, спойваюць сялян. Пасля гэтага ідзе лагічная выснова: „Нельга зрабіць заключэння, што яўрэі ў сённяшнім іх стане добрыя людзі, а таму і добрымі падданымі лічыцца не могуць"[2].

Пачатак XIX стагоддзя стаў часам замацавання негатыўнага стэрэатыпа пра яўрэяў, які склаўся ў свядомасці ўладароў. Грунтуючыся на дзяржавінскіх высновах, урад прызнаў яўрэяў нелаяльнымі падданымі, якія імкнуцца да ізаляцыі. Іх менталітэт быў ацэнены негатыўна, перш за ўсё з прычыны перавагі, якую яўрэі аддавалі невытворчым відам дзейнасці. Згодна з меркаваннем большасці даследчыкаў права, расійскія законы пра яўрэяў не з'яўляюцца агульным цэлым. Але, нягледзячы на розніцу ў стаўленні да „яўрэйскага пытання" асобных уладароў, іх аб'ядноўвае адно. Грунтам для фарміравання толькі пачаўшага сваё жыццё „яўрэйскага заканадаўства" Расійскай імперыі з самага пачатку стала ўяўленне пра „дрэннага яўрэя," які патрабуе перавыхавання, і такое стаўленне захавалася на працягу ўсяго XIX стагоддзя.

Наіўным было б меркаванне, што крыніцай негатыўнага стаўлення самаўладдзя да даволі шматкольканай групы яго падданых былі выключна хрысціянскія стэрэатыпы і вынікі дзяржавінскай „экспертызы". Гэты настрой падмацоўваўся рознага кшталту дакументамі і матэрыяламі, якія траплялі ў Санкт-Пецярбург з мяжы яўрэйскай аселасці. Справаздачы губернатараў аб стане гаспадаркі, сацыяльным жыцці і палітычнай актыўнасці насельніцтва былі апэратыўнымі крыніцамі інфармацыі, на падставе якой адбывалася распрацоўка прававых актаў. Таму для стварэння аб'ектыўнай карціны становішча яўрэяў у Расіі такім істотным з'яўляецца аналіз уяўленняў, якія склаліся ў мясцовых улад пра іх.

[2] Г. Р. Державин, *Сочинения*. С объяснительными примеч. Я. Грота. Издание Императ. АН: в 9 т., Санкт-Петербург 1872, т. 7, с. 248-261.

Гарадзенская губерня ад самага пачатку ўвайшла ў мяжу яўрэйскай аселасці і стала значным цэнтрам пасялення прадстаўнікоў яўрэйскай супольнасці. Калі звярнуцца да губернскай статыстыкі, якая грашыць значнымі недакладнасцямі, то атрымаем наступныя лічбы. У 1807 годзе ў Гародні жылі 2 538 яўрэі, у 1848 — 8 375, в 1897 — 46 919[3]. Адносна хрысціянскага насельніцтва горада яны складалі: на 1816 год — 85%, на 1859 — 53%, на 1887 — 68,7%, на 1898 — 50% жыхароў. Наяўнасць у горадзе такой вялікай колькасці яўрэяў уплывала на фарміраванне аблічча гарадской эканомікі і атмасферы Гародні наогул. Таму вандроўнік, які наведаў горад напрыканцы XIX стагоддзя, заўважыў: „Гародня — горад ціхі, каб не яўрэі і ваенныя, яго можна было б назваць сонным. Гародня мае характэрны выгляд літоўска-яўрэйскага горада”[4].

Асаблівасцю Гарадзенскай губерні на ўсім працягу яе існавання было тое, што яна з’яўлялася шматкультурным і поліканфесійным рэгіёнам. Сярод хрысціянскага насельніцтва пераважалі каталікі, якія нязменна стваралі апазіцыю для пануючай улады. Гарадзенцы, якія настальгічна ўзгадвалі часы Рэчы Паспалітай, пры кожным зручным выпадку нагадвалі расійскай уладзе, што яна з’яўляецца тут непажаданай і самазванай. Паўстанцы Т. Касцюшкі 1794 года, кіраўнікі паўстанняў 1830-1831 і 1863-1864 гадоў знаходзілі ў Гародні эмацыянальную і матэрыяльную падтрымку. Такі стан рэчаў меў некалькі наступстваў.

Не давяраючы каталікам, якіх звычайна залічалі ў палякі, улады збіралі звесткі пра іншых жыхароў краю і пільна сачылі за настроем іх думак. Пецярбург не знаходзіў падтрымкі сярод мясцовай эліты і таму накіроўваў вышэйшае чынавенства з цэнтра. Сярод гарадзенскіх губернатараў канца XIX стагоддзя быў нават славуты рэфарматар П. Сталыпін. Расійская знаць рэдка была глыбока дасведчана ў рэаліях беларускага жыцця і, тым больш, мала ведала пра яўрэяў, якім было забаронена жыць ва ўнутраных губернях краіны. Такім чынам, вышэйшыя губернскія чыноўнікі, як правіла, былі носьбітамі дрымучых хрысціянскіх забабонаў адносна яўрэяў, якія захоўвалі стойкасць дзякуючы адсутнасці непасрэднага кантакту з яўрэямі. Інакш было з тымі, хто ўсё жыццё пражыў каля прадстаў-

[3] Нацыянальны гістарычны архіў у Гародні (далей: НГАБ у Гародні), ф. 1, воп. 1, спр. 100, арк. 27зв.-28; воп. 20, спр. 1107, арк. 555; *Еврейская энциклопедия. Свод знаний о еврействе и его культуре в прошлом и настоящем*, под ред. Л. Кацельсона и Л. Г. Гинцбурга, Санкт-Петербург, б. г., т. 6, с. 791.

[4] А. П. Субботин, *В черте еврейской оседлости: отрывки из экономических исследований в западной и юго-западной России за лето 1887 года: в 2 выпусках*, Санкт-Петербург 1890, вып. 2, с. 4.

нікоў яўрэйскй супольнасці. У дакументах, якія былі складзены чыноўнікамі ніжэйшага звяна, калі і не хапае асабліва цёплых пачуццяў адносна яўрэяў, то, па меншай меры, не столькі шмат агульных абвінавачванняў альбо адкрытай лухты. Таму так розняцца паміж сабой апісанні рыс нацыянальнага характару яўрэяў у дакументах гістарычнага архіва.

Складаецца ўражанне, што больш за ўсё ўлады хвалявала праблема нелаяльнасці яўрэяў у дачыненні да дзяржавы. У кіруючых колах было распаўсюджана меркаванне, што яўрэі насамрэч лічаць сябе грамадзянамі Палесціны, а не краін пражывання. Згодна з гэтым, іх нельга лічыць грамадзянамі Расіі і патрыётамі. Патаемную сувязь, якая існавала паміж яўрэямі ўсяго свету і іх гістарычнай Радзімай, мясцовыя ўлады шукалі пастаянна. І вось у Пецярбург ляцела чарговае данясенне, якое пацвярджала яе наяўнасць. У 70-я гады XIX стагоддзя стала вядома, што яўрэі Беларусі заснавалі патаемны збор грошай у падтрымку яўрэйскай суполкі Іерусаліма. Нягледзечы на тое, што мэты яго былі вельмі шляхетнымі — дапамога старым, якія ехалі паміраць на гістарычную радзіму, арганізацыя школ, набыццё земляў у Палесціне для таго, каб займацца земляробствам, паліцэйскія ўлады былі занепакоены распаўсюджаннем гэтага збору, таму што ён не быў дазволены ўрадам[5].

У канцы 80-х гадоў XIX стагоддзя была выяўлена наяўнасць спецыяльных зборшчыкаў падаткаў, якія дзейнічалі ў яўрэйскім асяроддзі нягледзячы на ліквідацыю кагалаў і належаўшых да іх структур. У спробе матэрыяльна падтрымаць палесцінскіх пасяленцаў адміністрацыя ўбачыла чарговае праяўленне асаблівай рысы „яўрэйскага характару" — схільнасці да здрады. На карысць такой высновы было ўпартае ігнараванне праз яўрэяў легітымна існаваўшага і атрымаўшага падтрымку ўрада „Таварыства дапамогі яўрэям-земляробам і рамеснікам у Сірыі і Палесціне" (1890)[6].

Рэалізацыяй меркавання пра яўрэяў як часовых жыхарах Расійскай імперыі на ўзроўні вышэйшай улады стала афармленне іх статуса „паўграмадзян"[7]. Фармальна яны захавалі асабістую свабоду, але на справе былі жорстка прымацаваны да кагалаў (пазней — яўрэйскіх грамадстваў) і не мелі права на вольнае перамяшчэнне па краіне па-за мяжой аселасці. На лакальным узроўні ўпэўненасць у тым, што ў яўрэйскім характары закладзена схільнасць да здрады, выявілася ў пастаянных спробах перамясціць яўрэяў з тых раё-

[5] НГАБ у Гародні, ф. 1, воп. 7, спр. 268.

[6] Там жа, воп. 8, спр. 2499.

[7] И. Г. Оршанский, *Русское законодательство о евреях: Очерки и исследования*, Санкт-Петербург 1877, сс. 456.

наў, дзе яны маглі нанесці шкоду дзяржаўным інтарэсам. „Пільна сачыць за жыдамі і палякамі,” дазнавацца пра сапраўдныя мэты іх перамяшчэнняў па Беларусі яшчэ ў ваенным 1812 годзе загадаў сваім указам Аляксандр I[8]. Падазрэнні ў шпіянажы, накіраваныя ў бок яўрэяў, узнікалі пры кожнай новай дэстабілізацыі на мяжы[9].

Гісторыя яўрэяў Беларусі ведае шмат драматычных момантаў, звязаных з прымусовымі міграцыямі „ў імя абароны дзяржаўнай бяспекі”. Сярод іх і перасяленне яўрэяў з 50-вёрставай адлегласці ад мяжы[10], і выдаленне гэтых ненадзейных асоб з тэрыторыі крэпасных умацаванняў Брэст-Літоўска[11]. Сумная гісторыя апошняга пачалася ў 1841 годзе. Да гэтага раён новабудоўлі быў заселены прадстаўнікамі нізоў берасцейскага яўрэйства: 206 з 297, згодна з афіцыйнай статыстыкай, вялі паўжабрацкі лад жыцця. Іх хаты знаходзіліся ў марным стане, таму жадаючых набыць яўрэйскія халупы не знайшлося. Дзяржаўныя выплаты аказаліся літаральна міласцінай, на якую знайсці жытло ў іншым раёне горада было немагчыма. Вынік стэрэатыпу „яўрэй — дрэнны падданы,” жыхарства якога каля ваеннага аб’екта дазволіць нельга — канчатковае разарэнне няшчасных, якім загадалі ў найкарацейшы тэрмін вызваліць уласныя дамы.

У сваім данясенні на імя міністра ўнутраных спраў гарадзенскі губернатар зазначыў, што ў яўрэйскім характары прысутнічае такая рыса як дзіўная абыякавасць, якую яны праяўляюць адносна ўлад Расійскай імперыі. Большасць з іх падчас сацыяльных і палітычных катаклізмаў, якія час ад часу хвалявалі край, захоўвалі нейтральнасць. „Паміж яўрэямі Брэст-Літоўска няма ні аднаго, вядомага асаблівай адданасцю ўраду ці то даваўшага падставу падазраць сябе ў якіх-небудзь нядобразычлівых альбо шкодных намерах. Падчас мяцяжу, які быў у Царстве Польскім, ні адзін з іх не вызначыўся якім-небудзь учынкам, які б заслугоўваў пахвалы, істотным даносам альбо ахвяраваннем. Але, з другога боку, паміж імі не было таксама ні аднаго, які прымаў бы ўдзел у хваляваннях, якія мелі месца тады”[12]. Здаецца, нішто не магло змяніць гэты трывалы погляд, нават дакументы таго ж архіва, якія сведчаць пра дапамогу, якую яўрэі аказалі ўладам падчас вайны 1812

[8] Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі (далей: ДАРФ), ф. 1165, воп. 1, спр. 150.

[9] Там жа, ф. 109, воп. 6, спр. 705.

[10] Н. Д. Градовский, *Замечания на записку князей Голицыных о черте оседлости евреев*, Санкт-Петербург 1886, с. 273.

[11] НГАБ у Гародні, ф. 1, воп. 5, спр. 291.

[12] Там жа, арк. 2.

года і паўстання 1863-1864 гадоў. Нямала яўрэяў сталі ў гэты час добраахвотнымі агентамі ўрада і праваднікамі, за што атрымлівалі афіцыйныя падзякі[13].

Сапраўднай байкай усіх языкоў стаў у XIX стагоддзі славуты яўрэйскі ізаляцыянізм. Ён выяўляўся ў нежаданні наведваць рускую школу, мэтай якой была русіфікацыя ладу жыцця яўрэяў. У гэтым былі „вінаваты" рабіны[14]. Яшчэ адзін доказ — ухіленне ад нашэння еўрапейскай вопраткі, да чаго павінна было падштурхоўваць ужо „Усталяванне пра яўрэяў" 1804 года. Гэтая яўрэйская этнічная рыса, згодна з думкай улад усіх узроўняў, відавочна праяўлялася ў дзейнасці кагала. Старшыні заўсёды нешта задумвалі супраць урада, яўна альбо патаемна станавіліся натхніцелямі антыўрадавага, антырускага руху. Калі-некалі гэта праяўлялася ў акцыях адкрытага пратэсту. Напрыклад, у 1823 годзе яўрэі-гандляры адмовіліся прымаць медную манету, што выклікала сапраўдны вэрхал у Беларускім краі[15].

Яшчэ больш дзейснай аказалася акцыя па закрыццю шынкоў — сапраўдная антыалкагольная забастоўка! Пратэстуючы супраць высокіх плацяжоў за права гандляваць спіртным, яўрэі зачынілі ўсе піцейныя ўстановы ў Гародні роўна ў 13 гадзін у нядзелю, калі і сяляне, і мяшчане сталі вяртацца дахаты з храмаў. Гэта быў самы бойкі час для гандлю за ўвесь тыдзень. Не прададзеныя напоі — не сабраныя падаткі на карысць казны, а гэта ўжо нагадвала адкрыты бунт і спробу падрыву гаспадаркі. Паліцэйскі спраўнік з Гародні ўбачыў у гэтым варожыя дзеянні кагала. „Уплыў кагала на яўрэйскае грамадства неаднаразова быў ужо галоўнай прычынай розных процізаконных дзеянняў; цяперашняе здарэнне нельга не аднесці да яўнай смуты супроць законнай улады"[16].

Сярод рыс яўрэйскага характару, якія асабліва часта апісвалі афіцыйныя крыніцы, прысутнічала вераломства. Згодна з думкай чыноўнікаў, яўрэі маглі хітрасцю заманьваць у пастку наіўных і дабрадушных рускіх сялан. Справа на гэтым не канчалася. Аказвалася, што пад іх уплыў трапілі нават польскія памешчыкі. „Яўрэі валодаюць маёнткамі як сапраўдныя пасэсары, а паны нічога больш не адчыняюць, бо толькі што заключылі кантракты, аддаўшы яўрэям ва ўтрыманне хлеб, вінакурні, а ў некаторых маёнтках піцей-

[13] ДАРФ, ф. 109, воп. 4, спр. 67; воп. 23, спр. 163; воп. 38, спр. 247; воп. 42, спр. 138; НГАБ у Гародні, ф. 1, воп. 13, спр. 1402; воп. 27, спр. 90; воп. 31, спр. 5; воп. 34, спр. 175.

[14] Там жа, воп. 6, спр. 1480, арк. 1.

[15] Там жа, воп. 2, спр. 91, арк. 2.

[16] Там жа, спр. 918, арк. 5зв.

ны з корчамў прыбытак"[17]. У той час распаўсюдзілася нават прыслоўе, што пан без жыда толькі ў касцёл ходзіць.

Яшчэ горш было тое, што яўрэйскія падкопы не заўсёды проста было выкрыць. Другі дакумент устрывожаным голасам гарадзенскага губернатара Пацёмкіна паведамляе: „У малітоўных школах пад выглядам малітвы вядуцца дэбаты на незразумелым для паліцыі жаргоне, адбываюцца стачкі, усталёўваюцца кошты, накладваюцца забароны і праклёны"[18]. Адным махам былі асуджаны і самі яўрэі, і іх мова: губернатар прапанаваў проста забараніць яе. Нават Талмуд трэба было б выкладаць, згодна з яго думкай, на рускай мове. Яўрэйская каварнасць праяўляецца і ў тым, што яны ўмелі знайсці падыход да большасці расійскіх бюракратаў.

Міравы пасрэднік з Гарадзенскага павета ўстрывожана заўважаў у 1885 годзе, што „шкодны ўплыў не згубіў сваёй моцы, бо няма закону, які яны не маглі б абысці"[19]. Яго калега з Пружанскага павета паўтарае ўслед: „Чыны мясцовай паліцыі не ўдзяляюць належнай увагі вынішчэнню зла"[20]. Як кажуць, здагадайцеся самі, з якой прычыны... А вось віленскі, ковенскі і гарадзенскі ваенны губернатар схільны быў называць рэчы ўласцівымі імёнамі. „Мясцовыя чыноўнікі земскай паліцыі, а таксама ведамства дзяржаўнай маёмасці і акцызныя наглядчыкі, абавязаныя наглядаць, каб яўрэі не займаліся супрацьзаконным продажам напояў і арэндай вінакураных заводаў, паслабляюць у гэтым яўрэям, атрымліваючы з іх за гэта грошы"[21].

Адным з галоўных матываў, якія прымушалі ўлады ступаць на шлях „перавыхавання" сваіх яўрэйскіх падданых, была фанатычнасць, якую прыпісвалі яўрэям на працягу ўсяго XIX стагоддзя. Так тлумачылася паслядоўная прыхільнасць яўрэяў да нацыянальнай рэлігіі — іудаізму, нежаданне адступаць ад яго прынцыпаў ні ў вялікім, ні ў малым, катэгарычная адмова ад прыняцця хрысціянства. Яўрэйскую фанатычнасць падтрымлівалі рабіны: „Рабін духоўны мае фанатычны і ўсялякі шкодны ўплыў на яўрэйскае грамадства (...). Крайняя бядота дасягае бедных членаў беластоцкага яўрэйскага грамадства з-за ліхадзейства карыслівах асоб таго ж саслоўя (...). Бядоту выклікаюць пераважна духоўны рабін і заможныя"[22]. Пункт гледжання беластоцкага кіраўніцтва падтрымліваў берасцей-

[17] Там жа, воп. 1, спр. 1194, арк. 1.
[18] Там жа, воп. 8, спр. 2140, арк. 138-138зв.
[19] Там жа, спр. 1398, арк. 23.
[20] Там жа, арк. 22зв.
[21] Там жа, воп. 28, спр. 222, арк. 11.
[22] Там жа, воп. 6, спр. 501, арк. 1, 4.

скі павятовы страпчы, які станоўча характарызаваў духоўны суд, адзначаў аўтарытэтнасць рабінаў, а разам з тым не мог не выказаць адмоўнай думкі пра яўрэйскі характар. „Кожны з яўрэяў з усёй шчырасцю і справядлівасцю выяўляе сваю прэтэнзію, што сярод яўрэяў здараецца рэдка”[23].

У літаральным сэнсе слова, гета ў гарадах мяжы аселасці адсутнічала, прадстаўнікі яўрэйскай супольнасці пакрысе выходзілі за межы „яўрэйскіх вуліц”. Іх лад жыцця патрабаваў пастаянных дачыненняў з кліентамі іншых веравызнанняў. Аднак, нягледзечы на гэта, чалавечыя, міжасабовыя кантакты паміж яўрэямі і хрысціянамі ў XIX стагоддзі былі распаўсюджаны мала. Абрады іудаізму здаваліся многім хрысціянам незразумелымі, дзікімі, нават пагражаючымі. Тэндэнцыйна патрактаваныя падзеі біблейскай гісторыі пераносіліся на сёняшні дзень, а яўрэі называліся прынцыповымі ворагамі і хрысціянскай веры, і саміх хрысціян. Беларускі ваенны губернатар князь Мікалай Хаванскі ў 1828 годзе быў абсалютна ўпэўнены, што яўрэйскімі кнігамі „прадпісана шкодзіць хрысціянам усімі спосабамі, найстражэйшым чынам хаваць перад урадам таямніцы і перапыняць даносчыцтва супраць яўрэйскага народа”[24].

З такіх пазіцый разглядаліся рытуалы іудаізму. Яны былі патлумачаны як праява варожасці, яўны выклік хрысціянству. У выніку прадстаўнікі яўрэйскай супольнасці пакутвалі ад абвінавачванняў у прафанацыі свяшчэнных прадметаў, рытуальных забойствах, карыстанні магіяй. Даволі экстрэмісцка настроеныя свяшчэннікі імкнуліся кожную справу ператварыць у „прэцэдэнт”. Гэта тычылася гарадзенскай, вяліжскай рытуальных спраў і іншых, менш вядомых абвінавачванняў яўрэяў ў апаганьванні ікон, крыжа, гостыі. Многія з іх узнікалі па недарэчнасці — з-за няведання хрысціянамі абрадаў яўрэяў і наадварот. Красамоўны прыклад — абвінавачванне яўрэя М. В. Капялюшніка ў „таптанні нагамі і кіданні на падлогу ікон”. Як аказалася, ён, прыняўшы іх за звычайныя дошкі (пацямнелыя ад часу, яны былі складзены на гарышчы папярэднім жыхаром), прыкрыў іконамі скрынку з капелюшамі, якія збіраўся везці на кірмаш[25].

Як сярод мас, так і ў асяроддзі эліты расійскага грамадства шырока распаўсюдзіўся забабон, згодна з якім яўрэі звязваліся з нячыстым не толькі ў рытуальных, але і ў санітарна-гігіенічных адносінах. І калі сяляне і мяшчане былі ўпэўнены ў існаванні асаблі-

[23] Там жа, воп. 5, спр. 1860, арк. 33.
[24] Там жа, воп. 3, спр. 357, арк. 4зв.
[25] Там жа, ф. 98, воп. 1, спр. 1398.

вага „яўрэйскага паху", то „асветленыя" ўлады не адзін раз паказвалі на агульную схільнасць гэтай групы насельніцтва да неахайнасці і парушэння санітарна-гігіенічных нормаў. Генерал-губернатар Віленскай губерні ў 1856 годзе з раздражненнем пісаў: „Да гэтага часу часта сустракаюцца мужчыны, якія носяць неахайныя доўгія халаты, на галаве з валос пейсы, а жанчыны (...) пакрываюць галовы агіднымі парыкамі і застаюцца ў закаснелай неахайнасці як у вопратцы, так і ў хатнім жыцці — унутры дамоў і звонку на вуліцах"[26].

Прыхільнасць яўрэяў да нацыянальнай вопраткі раздражняла чыноўнікаў. Яскравыя вонкавыя адрозненні каголі вока, часта разглядаліся як своеасаблівы пасіўны бунт, упартая дэкларацыя яўрэямі сваёй адметнасці ў параўнанні з іншымі групамі насельніцтва. Такія паводзіны былі, згодна з думкай улады, асабліва недарэчнымі ў дзяржаўных установах, якія былі даступны як яўрэям, так і хрысціянам. Кацярына II дазволіла яўрэям увайсці ў склад дум і ратушаў, тым самым зрабіла магчымым актыўны кантакт паміж яўрэямі і хрысціянамі на палітычным полі. Аднак асабліва тут, згодна з думкай кіраўніцтва дзяржавай, яўрэі былі абавязаны паводзіць сябе сціпла і прыстойна — не вылучацца з масы дэпутатаў.

Нашэнне еўрапейскай вопраткі для людзей гэтай катэгорыі стала абавязковым яшчэ па „Усталяванню пра яўрэяў" 1804 года[27]. Аднак пастаянныя парушэнні закону з боку яўрэяў прымушалі чыноўнікаў зноў і зноў вяртацца да гэтага пытання. У адным з такіх указанняў мы сустракаем выказванне гарадзенскага губернатара: „Абавязаць яўрэяў, абраных у склад гарадскіх дум, магістратаў і ратушаў, пры пасяджэнні іх ва ўстановах для прыстойнасці насіць вопратку рускую альбо нямецкую"[28]. Вось яны, „культурныя акуляры" Хола! „Нямецкая і руская вопратка" прыстойная, дарэчная ва ўстановах, а яўрэйская (якая аб'ектыўна выглядала больш сціпла, бо хавала фігуру) — непрыстойная і неахайная.

Адну з паказальных рысаў яўрэйскай ментальнасці, згодна з думкай улад, складала лянота. Па версіі чыноўнікаў, менавіта гэтым тлумачыцца катэгарычнае нежаданне яўрэяў займацца сельскай гаспадаркай. Тут мы сустракаемся з сутыкненнем каштоўнасцей двух цывілізацый — аграрнай і прамысловай. Большую частку насельніцтва Расійскай імперыі складалі людзі, звязаныя з земляробчай працай — сяляне і паны. У другой палове XIX стагоддзя памешчыцкая гаспадарка была мала звязана з рынкам, мела натуральны

[26] Там жа, ф. 1, воп. 28, спр. 826, арк. 1.
[27] Там жа, воп. 1, спр. 100, арк. 63зв.
[28] Там жа, воп. 20, спр. 250, арк. 2.

характар. Галоўнай каштоўнасцю аграрнай цывілізацыі з'яўлялася зямля, найбольш шаноўнай працай прызнавалася яе апацоўка. Грошы самі па сабе непатрэбны для набыцця прадметаў першапачатковай неабходнасці, за іх купляюць прадметы раскошы. Звонкая манета асацыяваліся з гультайскім, заможным жыццём. Ні праваслаўе, ні каталіцызм не падтрымліваюць прымнажэння грошай, паслядоўна даводзяць немаральнасць багацця, праведнасць аскетычнага, беднага ладу жыцця.

Яўрэі, людзі новай, капіталістычнай цывілізацыі, якая асновай асноў лічыць менавіта грашовыя адносіны, былі актыўна задзейнічаны ў рынкавых адносінах. Няпэўнасць „яўрэйскага лёсу" калі прадстаўнікі гэтага народа цярпелі ганенні і не маглі быць упэўненымі ў заўтрашнім дні, склалася гістарычна і абумовіла іх накіраванасць на зараблянне грошай і каштоўнасцей. Няма сэнсу ўкладаць грошы ў зямлю, калі заўтра яна можа быць канфіскавана, а сам ты будзеш выгнаннікам. Але ўлады Расійскай імперыі не мелі ні жадання, ні часу вывучаць перапляценні яўрэйскага лёсу, і іх агульна абвінавацілі ў хцівасці і ляноце. Гарадзенскі губернатар, які зноў і зноў упэўніваўся ў нежаданні з боку яўрэяў станавіцца каланістамі, пісаў у 1850 годзе: „Па прычыне зведанай ухілістасці яўрэяў ад сельскагаспадарчых заняткаў і прыхільнасці да гарадскога больш гультайскага жыцця з абцяжарваннем народа, да гэтага часу паступіла ў гэтае званне вельмі невялікая колькасць яўрэяў"[29].

Ах, калі б дрэнны яўрэйскі ўплыў на рускі народ праяўляўся толькі ў імкненні абрабаваць яго! Але не, з прычыны сваёй амаральнасці яўрэі яшчэ і псуюць рускі народ, разбэшчваюць яго маральнасць. „Эксплуатацыя сялянскага насельніцтва яўрэямі не стала слабейшай, і яўрэі, якія пражываюць у мястэчках і вёсках, па-ранейшаму з'яўляюцца галоўным фактарам заняпаду сялянскай гаспадаркі, маруднасці ў павышэнні маральнага ўзроўню і паляпшэння сялянскага побыту", — пісаў міравы пасрэднік Гарадзенскага павета ў 1885 годзе[30].

Любімай зброяй у руках кіраўнікоў мясцовых адміністрацый была масавая сацыяльная міфалогія. Яна дазваляла пазбегнуць пошуку сапраўдных прычын падзей, складаных сувязей паміж з'явамі, а замест гэтага прыводзіць простыя, нярэдка зусім фантастычныя тлумачэнні. Так, напрыклад, калі ў 1877 годзе па Гарадзенскай губерні сталі настойліва курсіраваць чуткі пра тое, што хрысціяне рыхтуюць яўрэйскую разню, беластоцкі спраўнік дасціпна абвінаваціў ва ўсім яўрэйскую сквапнасць. „Вінаватымі ў распаўсюджан-

[29] Там жа, воп. 13, спр. 450, арк. 2зв.
[30] Там жа, воп. 8, спр. 1398, арк. 22.

ні чутак я лічу яўрэяў-гандляроў, якія спадзяюцца, што вынікам распаўсюджання чутак пра маючыя адбыцца беспарадкі стане высылка ў Беласток войскаў, што для гандляроў вельмі карысна”[31].

Што яшчэ абурала расійскую бюракратыю ў яўрэйскім характары? Напрыклад, схільнасць да суцяжніцтва. З рапарта міравога пасрэдніка Гарадзенскага павета можна даведацца, што яўрэі ў пасляграформенныя гады асвоілі прафесію сялянскіх адвакатаў. „Імкнуцца яўрэі выклікаць судовую спрэчку. Падбухторванні пачынаюцца з таго, што яўрэй тлумачыць селяніну, што ён карыстаецца толькі трэцяй часткай ураджаю, хаця мог бы атрымліваць палову, калі б пастараўся. Самазваныя адвакаты з яўрэяў атрымліваюць з сялян грошы за напісанне прашэнняў і да міравога пасрэдніка, і ў з’езд да міравога суддзі, і ў Сенат”[32].

Такім чынам, расійская бюракратыя лічыла, што яўрэі лянівыя. Тым не менш, яны не паміраюць ад голаду, а жывуць нават зусім нядрэнна, таму што маюць яшчэ адну вельмі карысную якасць — кемлівасць. На дзіва, і гэтая, здавалася б, станоўчая рыса, у разуменні ўлад, набывала адмоўную афарбоўку. Яшчэ адна цытата з дакумента — рапарта ваўкавыскага гараднічага за 1857 год, у якім мова ідзе пра карыснасць рабінскага суда, які дазваляе вырашаць унутрыяўрэйскія дробныя спрэчкі. „[Духоўны суд — В. С.] зніштчае скаргі, якія вырашаюцца вельмі складана з прычыны заблытанасці і выкрутасаў яўрэйскіх”[33].

Аказваецца, яўрэі прымяняюць сваю кемлівасць не там, дзе трэба. У асноўным іх дапытлівы розум накіраваны на вырашэнне пытання пра тое, як бы лепш падмануць хрысціяніна і абчысціць яго кішэні. Ці можна перарабіць яўрэя? Улада шукала выйсце. Дазваляючы яўрэям паступаць у садаводніцкія вучылішчы, гарадзенскія чыноўнікі ў 1852 годзе адзначалі: „Карысна было б аддаць у садовыя ўстановы яўрэяў, з якіх, па кемлівасці іх, маглі б выйсці вельмі добрыя садоўнікі”[34]. На жаль, і ў гэтым выпадку яўрэі пацвердзілі дрэнную думку, якая склалася на іх конт. Жадаючых прымяніць свой дапытлівы розум на пасадзе садоўніка ў Гарадзенскай губерні так і не знайшлося...

У архіўных дакументах і так няшмат водгукаў пра станоўчыя рысы яўрэйскага характару. Але, калі паставіць перад сабой мэту вылучыць іх, то можна было б узгадаць згуртаванасць яўрэйскага народа. Як адзначаў міравы пасрэднік Гарадзенскага павета ў 1885 годзе, „сярод яўрэяў існуе вядомая ўсім моцная салідарнасць”[35]. Менавіта ў ёй каранілася ўласцівая яўрэйскаму асяроддзю схільнасць да дабрачыннай дзейнасці. Гарадзенскія ўлады ў сярэдзіне XIX стагоддзя адзначалі адсутнасць жабракоў-яўрэяў. Са сваімі сацыяль-

ымі праблемамі яўрэі спраўляліся самі. Аднак і тут ураду было чым папракнуць сваіх яўрэйскіх падданых. Рэльефней за ўсё гэта пазіцыя выяўлена ў водгуку міністра ўнутраных спраў віленскаму, ковенскаму і гарадзенскаму генерал-губернатару ад 25 жніўня 1881 года. „Дзякуючы сваёй згуртаванасці яны, за невялікім выключэннем, дружна накіравалі свае сілы не на павелічэнне вытворчых сіл дзяржавы, а на эксплуатацыю карэнных жыхароў, і пераважна беднейшых класаў насельніцтва, чым і выклікалі з яго боку пратэст, які выліўся ў жалю годную форму — у гвалт”[36].

Такім чынам, на працягу XIX стагоддзя расійскі бюракратычны апарат паспеў скласці для сябе даволі поўнае ўяўленне пра „яўрэйскі характар”. Аднак інфармацыя, якую мы знаходзім па гэтай тэме ў архіўных дакументах, аб’ектыўна характарызуе не столькі яўрэяў, колькі саміх царскіх чыноўнікаў. Ім уласціва вузкасць свядомасці і павярхоўнасць ведаў пра тых, чый лёс яны спрабавалі вырашаць так катэгарычна і безапеляцыйна. Гэта прыводзіла да фарміравання вузкіх, шорсткіх і абстрактных уяўленняў пра буйную і ўплывовую этнаканфесійную групу, стварэнню шаблонаў і негатыўных этнічных стэрэатыпаў.

Самае сумнае, што адмоўныя стэрэатыпы мелі шырокае распаўсюджанне сярод мас хрысціян любога ўзроўню, больш за тое, яны ўносіліся свядома, па замове дзяржаўнай ідэалогіі, сфарміраванай на падставе суб’ектыўных прадстаўленняў і асабістага негатыўнага вопыту яе творцаў. На гэтай рыхлай глебе фарміраваўся цэлы напрамак дзяржаўнай палітыкі, „яўрэйскае заканадаўства”, меры якога ў XIX стагоддзі так часта не давалі чаканага выніку менавіта з-за памылковасці пакладзеных у яго аснову прадстаўленняў. Вынік бачны: ствараласяя непрадуктыўнае становішча, пры якім у выніку і дзяржава, і яе яўрэйскія падданыя неслі страты.

Сярод сялян быў распаўсюджаны дэманізаваны вобраз яўрэя. У народнай міфалогіі замацавалася ўяўленне, што яўрэі займаюцца чараўніцтвам. З гэтага лагічна вынікала, што і змаганне з імі павінна грунтавацца на выкарыстанні магічных спосабаў. На пачатку XIX стагоддзя сярод яўрэяў Гарадзенскай губерні быў распаўсюджаны забабон, згодна з якім рука мёртвага чалавека можа пагрузіць чалавека ў глыбокі, „мёртвы” сон. Таму, плануючы абрабаваць яўрэй-

31 Там жа, воп. 15, спр. 1499, арк. 156зв.
32 Там жа, воп. 8, спр. 1398, арк. 25.
33 Там жа, воп. 5, спр. 1860, арк. 36зв.
34 Там жа, воп. 22, спр. 263, арк. 1зв.
35 Там жа, воп. 8, спр. 1398, арк. 24.
36 Там жа, воп. 16, спр. 1214, арк. 3.

скую карчму ў ноч з 16 на 17 сакавіка 1845 года, селянін Трахімовіч ўзяў з сабой руку, адкроеную ў нядаўна пахаванай сялянкі Докавай. У карчму ён улез праз акно і скраў „2 гарнцы солі, 2 пірагі і грошай 7 рублёў 65 капеек, пасля таго, як яны былі знойдзены ў хаце Трахімовіча, соль і наяўнасць звернуты гаспадару, а сам ён прысуджаны да 5 удараў батам і выслання на катаргу”[37].

Але яшчэ лепшым сродкам, які дапамагае ў рабаванні дамоў, лічылася адкроеная рука мёртвага яўрэя, што таксама адюстравалася ў судовых матэрыялах гістарычнага архіва. Вось сведчанне селяніна Ваўкавыскага павета С. В. Прушыньскага: „Прыгонныя сяляне маёнтка майго Сакольніка, кухар А. Маслоўскі і лёкай І. Вайнішчук па прыроджанай схільнасці сваёй да ўсяго кепскага, якая дапаўнялася незвычайнай смеласцю, мелі на мэце абрабаванне майго грашовага фундуша, а можа, і да адабрання ў мяне жыцця. Падгаварылі сялян да раскапання магілы і адкраення ў мёртвага яўрэйскага дзіцяці рукі, якая, як яны верылі, можа дапамагчы ў чарадзейскім усыпленні людзей (...). Яны, дамовіўшыся паміж сабой, паўтаралі, што гэтую руку набылі для ўсыплення прыгонных дзяўчат і задавальнення сваіх любоўных жаданняў”[38].

Значную частку насельніцтва Гарадзенскай губерні ў XIX стагоддзі складалі каталікі. Гэтая асаблівасць уплывала на кшталтаванне абвінавачванняў у адрас яўрэяў. Нярэдка каталіцкае духавенства правакавала праследаванні яўрэяў, а ў мясцовасцях, акаляючых езуіцкія кляштары, абвінавачванні яўрэяў у прафанацыі гостыі распаўсюджваліся часцей[39]. Так было таксама ў Слонімскім павеце Гарадзенскай губерні. У выніку непаразумення, якое ўзнікла з-за няправільнага трактавання хрысціянамі сэнсу абрадаў свята Пурым, мясцовыя яўрэі ў 1827 годзе былі абвінавачаны ў парадзіраванні паводзін ксяндза ў час святога набажэнства, выкарыстанні пры спяванні „хрысціянскіх малітоўных словаў” і прафанацыі крыжа”[40].

Між іншым, вера ў магічную моц астанкаў чалавека існавала таксама ў яўрэйскім асяроддзі таго часу. У 1829 годзе дзве скідальскія яўрэйкі Ф. Хаймава і Ч. Беркава былі асуджаны за „выкарыстанне астанкаў для недазволенага лячэння, спалучанага з забабонамі”. Гэтыя жанчыны збіраліся выкарыстаць знойдзены каля грэблі кавалак чалавечага чэрапа ў мэтах лячэння гарачкі ў малой дачкі Чэрні Хаімавай[41].

[37] Там жа, воп. 12, спр. 44, арк. 3зв.
[38] Там жа, воп. 11, спр. 374, арк. 3-3зв.
[39] H. Węgrzynek, *„Czarna legenda” Żydów. Procesy o rzekome mordy rytualne w dawnej Polsce*, Warszawa 1995, s. 162.
[40] НГАБ у Гародні, ф. 1, воп. 2, спр. 2082, арк. 53.
[41] Там жа, воп. 3, спр. 352, арк. 14зв., 32зв.

У час сацыяльных патрасенняў, голаду, эпідэмій раўнавага ў міжэтнічных стасунках парушалася. Пачынаўся пошук вінаватых у народнай нядолі. Зручнымі кандыдатамі ў гэтым выпадку станавіліся яўрэі: былі чужымі, народная міфалогія прыпісвала ім чараўніцтва, а ў іх нацыянальным характары прдкрэсліваўся шэраг вельмі непрыемных недахопаў. Лад жыцця яўрэяў быў для хрысціян непрымальным, абрады — незразумелымі і падазронымі. Ад гэтага недалёка было да наступнага кроку — калі чужы з'яўляецца небяспечным, яго трэба знішчыць. Такая пастаноўка пытання, падмацаваная верай у варожасць яўрэяў да хрысціян і сапсаванасць яўрэйскай рэлігіі прыводзілі да абвінавачвання яўрэяў у рытуальных забойствах.

Не міналі справы такога роду і Беларусь. 31 сакавіка 1816 года перад Вялікаднем у Гародні па абвінавачванню ў забойстве з мэтай атрымання хрысціянскай крыві ад дзяўчынкі Марыяны Адамовічавай быў затрыманы член кагала С. Лапін[42]. 23 красавіка на выгане каля горада было знойдзена цела дзяўчынкі, паколатае ў многіх месцах. Яе вопратка была разарвана, правая рука адкроена ад локцевага сустава[43]. Наяўнасць на целе шматлікіх ран, а таксама блізкасць падзеі да Вялікадня далі антысемітам падставу сцвярджаць, што адбылося рытуальнае забойства. У якасці доказаў вінаватасці было прызнана сведчанне дзяцей Лапіна, якія часта бавіліся разам з Марыянай. Як быццам бы яны бачылі, як у дзень знікнення дзяўчынкі іх бацька гнаўся за ёй па панадворку, а ў той час шмат яўрэяў чакала яго ў хаце.

Падчас другога даследавання цела ўрачэбная ўправа прыйшла да высновы, што смерць наступіла з прычыны „разліцця крыві" і што „кроў з цела выліта не была". У час вобыску ў С. Лапіна былі знойдзены малаток і кап'яцо, якія, як растлумачаў гаспадар, ён выкарыстоўваў для чысткі папер, працуючы ў кагальнай канцылярыі. Справа цягнулася да лютага 1817 года, калі ў Санкт-Пецярбург са скаргаю накіраваўся дэпутат яўрэйскага народа Зундэль Зонэберг, які змог сустрэцца з блізкімі да цара асобамі. М. М. Навасільцаў, які пазнаёміўся з беларускімі яўрэямі ў час інспекцыі гарадзенскіх фабрык, і міністр духоўных спраў Галіцын не былі юдафобамі. Яны звярнулі ўвагу на тое, што на тэрыторыі мяжы аселасці існуе тэндэнцыя ўсе нерасследаваныя справы звальваць на яўрэяў[44].

[42] Там жа, спр. 357.

[43] Н. Н. Голицын, *История русского законодательства о евреях: в 2 т.*, Санкт-Петербург 1886, т. 1, с. 665.

[44] С. Дудаков, *Война 1812 года и ритуальные процессы в России*, [в:] *Ковчег: Альманах еврейской культуры*, Москва 1990, с. 276.

Вынікам іх дзейнасці стала выданне 28 лютага 1817 года (аб'яўленае 6 сакавіка) Найвышэйшага павялення Аляксандра I: „Каб яўрэі не былі абвінавачаны ў забойстве хрысціянскіх дзяцей згодна з адным забабонам, як быццам яны патрэбу маюць у хрысціянскай крыві, а што калі б дзе-небудзь здарылася забойства і падазрэнне падала б на яўрэяў, без прадузятасці, што яны зрабілі гэта для атрымання хрысціянскай крыві было б праведзена следства на законнай аснове і праве"[45]. Справа была часова пакінута, каб узнавіцца праз дзесяць год. Зноў былі арыштаваны С. Лапін і яго дачка, расследаванне цягнулася каля чатырох год і нарэшце па жаданню пракурора спынена. Пасля гэтага колькасць абвінавачванняў яўрэяў у рытуальных забойствах скарацілася, але сам крывавы паклёп заставаўся папулярнай тэмай у юдафобскіх выданнях XIX — пачатку XX стагоддзяў.

Відавочна, што ў Гарадзенскай справе дзейнічалі эканамічныя і палітычныя фактары. Колькасць яўрэяў ў Гародні заўсёды была значнай. У 1816 годзе, пра які мы гаворым, яўрэі скаладалі ў Гародні 85% жыхароў горада, значная доля якіх прымала ўдзел у гандлі і рамястве, тым самыя з'яўляючыся натуральным канкурэнтам. Гэтае эканамічнае супрацьстаянне не раз праяўлялася ў гаспадарчых канфліктах, напрыклад, у выгнанні яўрэяў з хрысціянскіх цэхаў[46]. Быў і палітычны грунт, звязаны з падзеямі 1812 года, калі падчас французска-расійскай вайны пры ўзяцці горада партызанскім злучэннем Дз. Давыдава ўлада ў Гародні часова была перададзена не прадстаўнікам польскай арыстакратыі, якая акампраметавала сябе падтрымкай улад Напалеона, а яўрэйскаму кагалу[47].

Даследаванне антыяўрэйскіх стэрэатыпаў шмат дае для разумення не толькі прычын канфліктаў паміж хрысціянамі і яўрэямі ў XIX стагоддзі, але і наогул для вывучэння міжгрупавых стасункаў. У фарміраванні вобразу „чужога" іншай нацыянальнасці (яўрэя, цыгана) мы можам сустрэць агульныя рысы. На жаль, даследаванні па гэтай тэматыцы з'яўляюцца актуальнымі да сёняшняга часу. Як адзначае К. Зяньковская, „дэманы страху, нянавісці і агрэсіі не засталіся ў мінулым, як гэта ўяўлялі сабе лепшыя прадстаўнікі эпохі Асветніцтва. Існуюць яны і сёння, мяняючы толькі маскі, сімвалы і гістарычныя касцюмы"[48].

[45] Е. Брант, *Ритуальное убийство у евреев*, кн. 2, Белград 1927, с. 53.

[46] НГАБ у Гародні, ф. 1, воп. 2, спр. 523.

[47] Д. Давыдов, *Дневник партизанских действий 1812 года*, [в:] *Сочинения: в 2 т.*, Санкт-Петербург 1893, т. 2, с. 146.

[48] K. Zieńkowska, *Stereotyp Żyda w publicystyce*, [w:] *Lud żydowski w narodzie polskim: materiały sesji naukowej w Warszawie 15-16 września 1992 r.*, pod red. J. Michalskiego, Warszawa: IH PAN, s. 81.

**Streszczenie**

W Imperium Rosyjskim ukształtował się negatywny wizerunek Żyda, co w konsekwencji powodowało dyskryminacyjną politykę wobec tej społeczności. Ukazami Katarzyny I, Elżbiety I i Katarzyny II Żydzi systematycznie byli wyganiani z granic Rosji. Antysemityzm elit rosyjskich przenosił się do warstw plebejskich. W XIX wieku, gdy cała Białoruś znalazła się w granicach Rosji, nośnikami mitów antysemickich stali się dygnitarze i arystokraci rosyjscy. Z dostępnych dokumentów wynika, że mit „złego Żyda" zakładał nielojalność wobec państwa i skłonności do zdrady. Żydom nadano status obywateli czasowo przebywających na terenie Rosji. Na Białorusi stanowili oni kategorię ludzi podejrzanych na równi z Polakami. Stosowano wobec nich różnego rodzaju sankcje ekonomiczne ograniczające swobodę działalności gospodarczej. Władze argumentowały, że w ten sposób pragnęły chronić ludność chrześcijańską przed żydowskim wiarołomstwem. Przez całe XIX stulecie władze przejawiały skłonności do stałego resocjalizowania ludności żydowskiej. Przyczyną takich działań miał być przypisywany Żydom fanatyzm religijny. Za najniebezpieczniejszą kategorię uznawano rabinów, którzy w swojej społeczności cieszyli się ogromnym autorytetem. W dokumentach z XIX wieku bardzo mało jest sygnałów płynących ze strony funkcjonariuszy państwowych o pozytywnych cechach charakteru żydowskiego.